# Гісторыя

*Г.А. КАРПЕЧАНКА*

## ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ І АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МАГНАЦКАГА РОДУ ТЫШКЕВІЧАЎ У ГІСТАРЫЯГРАФІІ КАНЦА XIX – ПАЧАТКУ XXI ст.

Посвящена историографии общественно-политической и просветительской деятельности магнатского рода Тышкевичей. Рассматриваются публикации в белорусской, российской и советской литературе конца XIX – начала XXI в.

The article is devoted to historiography, socio-political and educational activities of magnate clan of Tyszkiewicz. It considers some publications in Belarusian, Russian and Soviet literature of the late XIX – the beginning of the XXI century.

Сярод знакамітых беларускіх магнацкіх родаў асаблівае месца займаюць Тышкевічы. Яны адыгрывалі значную ролю ў дзяржаўным, палітычным і асабліва культурным жыцці нашай краіны. Прадстаўнікі гэтага роду жылі на Беларусі, Украіне, у Літве і Польшчы. Асаблівую вядомасць атрымалі браты з лагойскай галіны роду – Канстанцін і Яўстафій – археолагі, этнографы, краязнаўцы, стваральнікі Лагойскага і Віленскага музеяў старажытнасцей, Віленскай археалагічнай камісіі.

Першыя працы, якія былі прысвечаны Віленскаму музею старажытнасцей, з’явіліся ў другой палове XIX ст. У артыкуле М. Гарадзецкага «Виленский музей древностей. По поводу тридцатилетия годовщины его создания»[1] аўтар раскрывае мэты рэарганізацыі музея, паказвае ролю А. Сталыпіна ў яго разбурэнні, крытычна і нават варожа ставіцца да музея, яго фундатара Я. Тышкевіча. Ён падкрэслівае недакладнае стварэнне экспазіцый і нядбайнасць у складанні каталогаў, у чым абвінавачвае Я. Тышкевіча і захавальніка бібліятэкі, вучонага сакратара Круповіча. М. Гарадзецкі вызначыў, што ў музеі былі сабраны ў большасці экспанаты, звязаныя з «польскім панаваннем», наўмысна ігнараваліся прадметы, якія асвятлялі законнасць панавання ў паўночна-заходнім краі расійскіх улад. Нават прыводзілася размова экскурсавода музея Якубовіча з дзецьмі як прыклад кепскага стаўлення да Расійскай імперыі: «А чый гэта, міленькі, партрэт?» – «Гэта Стэфан Баторый». – «Добра, дзіця, добра, гэта наш Стэфан; а чым знакаміты быў той кароль Стэфан?» – «Маскалей біў, дзядуля». – «Выдатна, дзіця, выдатна, вось атрымай, міленькі, цукерку»[2].

У творах А.Н. Пыпіна «История русской этнографии»[3], «Белорусская этнография»[4] пададзены звесткі пра Віленскі музей старажытнасцей і яго спусташэнне, узгадваецца «Апісанне Барысаўскага павета». З гэтага часу ў літаратуры браты Тышкевічы пачынаюць разглядацца са станоўчага боку.

У канцы XIX ст. у польскай навукова-даведачнай літаратуры з’яўляюцца звесткі пра род Тышкевічаў. Аб родзе братоў, іх навуковай дзейнасці былі змешчаны артыкулы ў «Encyklopedyja powszechna»[5]; аб стварэнні, структуры Віленскага музея старажытнасцей, дзейнасці археалагічнай камісіі пісалася ў артыкулах у «Wielka encyklopedyja powszechna ilustrowana»[6].

У пачатку XX ст. з’явілася кніга Юзэфа Тышкевіча «Tyszkiewicziana»[7], якая цалкам была прысвечана роду Тышкевічаў, у тым ліку і лагойскай галіне. У ёй змяшчаўся спіс надрукаваных твораў Яўстафія і Канстанціна, падаваліся біяграфічныя звесткі амаль пра ўсіх прадстаўнікоў гэтага роду.

Акадэмік Я.Ф. Карскі ў працы «Беларусы»[8] высока ацаніў «Апісанне Барысаўскага павета» Я. Тышкевіча.

Больш за дваццаць гадоў род Тышкевічаў заставаўся па-за ўвагай даследчыкаў. У выданні Менскага акруговага таварыства краязнаўства «Лагойскі раён Менскае акругі. Кароткае краязнаўчае апісанне»[9] прыводзяцца звесткі пра стан Лагойска ў 1920-я гг., аб Канстанціну Тышкевічу, разглядаецца экспазіцыя Лагойскага музея.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны імя Тышкевічаў узгадваецца ў сувязі з лекавымі крыніцамі ў Лагойску ў артыкуле Л. Маркава «Санаторна-курортнае лячэнне працоўных у Беларусі»[10]. Але трэба падкрэсліць, што з 1920-х па 1960-я гг. інфармацыі аб родзе Тышкевічаў у савецкай гістарыяграфіі не з’явілася. На польскай мове выйшла праца H. Cehak-Holubowiczowa «Muzeum starozitnosci wilenskiej komisji archeologicznej, a

museum arheologiczne uniwersytetu Stefana Batoriego»[11], дзе паказана роля Яўстафія – «бацькі літоўскай археалогіі» – у стварэнні Віленскага музея старажытнасцей.

Пазней імёны Канстанціна і Яўстафія ўзгадваюцца ў артыкуле Л.В. Аляксеева «Очерк истории белорусской дореволюционной археологии и исторического краеведения до 60-х годов XIX в.»[12]. Аўтар прыводзіць цікавыя выказванні Яўстафія Тышкевіча аб сваёй дзейнасці: «Желание выяснить истину и противопоставить ее представлениям простого народа и наивных соседей внушило мне мысль потревожить места, предназначенные вечному упокоению… Здесь встретилось немало трудностей. Я должен был щедро платить своим же собственным крепостным и работать наравне с ними, лишь бы они согласились на такой грех. Только таким образом… удалось раскопать один из самых больших курганов»[13]. У артыкуле таксама падкрэсліваецца стаўленне Канстанціна Тышкевіча да археалогіі: «Отношение к новой науке у самого исследователя было крайне двойственным: с одной стороны, он понимал, что при раскопках “могил отверзается для нас Заря совершенно новых познаний”, “чтобы… изучить прошедшее, мы разрываем могилы…”, что “главнейшее и существенное условие состоит в беспрестанном сравнении, посредством которого она… составляет некоторую основу для событий эпохи, не доставившей нам… письменными памятниками”; с другой – в науке археологии, по его мнению, “все без верных данных, создается на догадках более или менее вероятных, все составляет род какой-то гипотезы”»[14].

Лагойскаму і Віленскаму музеям быў прысвечаны артыкул С. Акуліча «Музеі братоў Тышкевічаў»[15], у якім апісваюцца іх заснаванне і лёс, унікальныя экспанаты.

У 1970-х гг. пачынаецца даследаванне маёнткаў і паркавых комплексаў, што маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. У іх ліку лагойскі парк і палац Тышкевічаў. Іх апісанне знаходзіцца ў кнізе В.Г. Анціпава «Парки Белоруссии»[16], у працы С. Акуліча і Б. Сасноўскага «Лагойск: Гісторыка-эканамічны нарыс»[17].

М.М. Улашчык у кнізе «Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода»[18] разглядае дзейнасць Віленскай археалагічнай камісіі.

Пасля рэарганізацыі Віленскага музея старажытнасцей некаторыя экспанаты апынуліся ў розных краінах, у тым ліку і ў Польшчы, аб чым піша Л.Д. Побаль у працы «Древности Белоруссии в музеях Польши»[19] і нават друкуе выявы некаторых экспанатаў.

Гісторык і краязнавец Г.А. Каханоўскі ў працах «Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX ст.»[20], «Адзін з ранніх даследчыкаў беларуска-літоўскага памежжа»[21], «Адчыніся, таямніца часу: Гісторыка-літаратурны нарыс»[22], «Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму»[23], «Прадвесне навукі»[24] распавядае пра жыццё і навуковую дзейнасць братоў Тышкевічаў. Г.А. Каханоўскі і А.Г. Каханоўскі ў творы «Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч»[25] апісалі ўзнікненне роду і падкрэслілі талерантнае стаўленне яго прадстаўнікоў да рэлігіі, паказалі сям'ю навукоўца, станаўленне Яўстафія як даследчыка, захапленне навукай, стварэнне музея старажытнасцей, падрабязна разгледзелі яго археалагічную дзейнасць. На сённяшні момант гэта адзіная грунтоўная праца, прысвечаная жыццю і творчаму шляху аднаго з прадстаўнікоў роду Тышкевічаў.

М. Віж у нарысе «Чары даўніны»[26] апісвае краявіды і гісторыю Лагойшчыны і старажытнага горада, яго ўладароў, узгадвае ўспаміны Ф. Булгарына і падарожніка П. Шпілеўскага.

Ураджэнец Нарачанскага краю, літоўскі географ, краязнаўца, прафесар Вільнюскага універсітэта Ч. Кудаба здзейсніў падарожжа па рацэ Віліі ад вытокаў да вусця і ў манаграфіі «Па Віліі»[27] неаднойчы ўпамінае падарожжа Канстанціна Тышкевіча па гэтай рацэ, вынікі і тыя цяжкасці, з якімі ён сутыкнуўся.

А. Марціновіч у артыкуле «Ля агню даўніны»[28] нагадвае пра сям'ю і творчы шлях Я. Тышкевіча, спасылаючыся на твор Г.А. Каханоўскага і А.Г. Каханоўскага «Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч». Манаграфія Я. Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета» ўзгадваецца ў выданні «Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Барысава і Барысаўскага раёна»[29].

Даследчыкаў цікавіць лёс музеяў Тышкевічаў і тое, што адбылося з іх экспанатамі. Н. Гулак у артыкуле «Тышкевіцкі музей старажытнасцей: малюнкі спусташэння»[30] падрабязна апісвае рэарганізацыю Віленскага музея старажытнасцей, стварэнне камісіі для разбору прадметаў, якія знаходзяцца ў гэтым музеі, стаўленне да дадзенага пытання А. Сталыпіна вызначае паводзіны Я. Тышкевіча як «дваістыя»: не даваў падставу меркаваць аб яго нядобранадзейнасці і таму галасаваў разам з камісіяй і у той жа час утойваў каталогі і экспанаты, напісаў афіцыйны пратэст.

У апошнія дзесяцігоддзі да гэтай тэмы звяртаецца і М. Яніцкая ў артыкуле «Скутак мары Тышкевічаў»[31], які прысвечаны роду Тышкевічаў, бацькам і іх захапленням, стварэнню і лёсу музеяў Тышкевічаў. Аўтар выказвае пажаданне вярнуць хоць штосьці з вывезеных каштоўнасцей на Радзіму.

М.Ф. Спірыдонаў у артыкуле «Першая ардынацыя ў Беларусі»[32] падае гісторыю Лагойскага графства і дадае карту ўладанняў Тышкевічаў.

У канцы XX – пачатку XXI ст. зноў выходзяць у свет працы, у якіх узгадваецца род Тышкевічаў. Артыкул З. Яцкевіча «Радавод Яўстафія Тышкевіча»[33] прысвечаны беларускай галіне гэтага роду,

аўтар падае гісторыю герба «Ляліва» і апісвае яго: «Ён уяўляе з сябе блакітную парчу, на якой выява залатога маладзіка рагамі ўгару і шасціканцовай зоркай таго ж колеру»[34]. Унізе герба лаўры спалучаліся са стужкай, на якой паводле геральдычнай традыцыі быў надпіс: «Церніі не палохаюць»[35].

У выданні «Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Лагойскага раёна»[36] падаецца радавод з вызначэннем усіх галін і ліній найбольш вядомых прадстаўнікоў роду Тышкевічаў.

Праца А.А. Гужалоўскага «Нараджэнне беларускага музея»[37] ўтрымлівае гісторыю стварэння Лагойскага і Віленскага музеяў, а таксама звесткі пра іх экспазіцыі: структуру, колькасць экспанатаў.

Падарожжа Канстанціна Тышкевіча па Віліі ўзгадваецца ў кнізе «Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Вілейскага раёна»[38].

Пра некаторыя працы «многія ведаюць, але чыталі адзінкі», – піша А. Балябін, гісторык, супрацоўнік залы беларусікі і краязнаўства ЦГБ Барысава. Ён зрабіў пераклад раздзела кнігі Яўстафія Тышкевіча «Апісанне Барысаўскага павета». Гэты ўрывак – «1812 год у вядомай працы Я. Тышкевіча» – надрукаваны ў раённай газеце «Гоман Барысаўшчыны»[39].

У кнізе «Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў»[40] падаецца разбор этнаграфічнай дзейнасці Канстанціна і Яўстафія, прыводзяцца прыклады сабраных імі песень, прымавак, прыказак. Аўтар заўважае, што Яўстафій Тышкевіч як даследчык найперш праявіў сябе ў артыкулах, прысвечаных календару беларусаў, ён адзін з першых фальклрыстаў апісаў святкаванне Каляд.

Канстанціну Тышкевічу ў 2006 г. споўнілася 200 гадоў з дня нараджэння. У Лагойску адбылося святкаванне юбілею. Гэтай падзеі прысвечаны артыкулы А. Капцюга «Граф Канстанцін Тышкевіч»[41], С. Грынь «У памяці лагайчан – назаўжды»[42], А. Занкавіча «Годны прадстаўнік – Канстанцін Тышкевіч»[43].

Пра значнасць музеяў братоў Тышкевічаў піша А. Мальдзіс у артыкуле «Музей древностей»[44] і ставіць пытанне аб магчымасці вяртання Беларусі каштоўнасцей, якія былі вывезены падчас войнаў.

С. Жыгунова ў артыкуле «Постаць К.П. Тышкевіча і яго роля ў фальклорна-этнаграфічным даследаванні Лагойшчыны (матэрыялы для правядзення экскурсіі)»[45] прыводзіць прыклады паданняў, сабраных Канстанцінам Тышкевічам, калі ён падарожнічаў па рацэ Віліі.

У савецкі час у некаторых энцыклапедычных выданнях, такіх як «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі»[46], «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва»[47], змяшчаліся звесткі аб гістарычным мінулым Лагойска, курганах і гарадзішчах, старажытных архітэктурных помніках, артыкулы пра жыццёвы і творчы шлях братоў Тышкевічаў.

Энцыклапедыя «Этнаграфія Беларусі»[48] мае невялікія артыкулы пра жыццё Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў.

«Атлас гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён»[49] змяшчае гістарычныя карты, у тым ліку і Барысаўскага павета XIX ст., якому Я. Тышкевіч прысвяціў сваю працу.

У апошнім выданні «Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя»[50] ёсць артыкулы пра герб «Ляліва», род Тышкевічаў і саміх братоў, іх паплечнікаў і інш.

Такім чынам, на сённяшні момант існуе шэраг артыкулаў у газетах, часопісах і энцыклапедычных выданнях, прысвечаных роду Тышкевічаў. Аўтараў найбольш цікавіць лёс і дзейнасць Канстанціна і Яўстафія Тышкевічаў, а таксама створаныя іх намаганнямі музеі. Сустракаюцца артыкулы, дзе разглядаюцца ўсе прадстаўнікі гэтага роду, апісваюцца парк і палац у Лагойску. У большасці прац прысутнічаюць браты Тышкевічы і іх руплівая дзейнасць, але сустракаецца і варожае стаўленне. На сённяшні момант няма манаграфій на рускай ці беларускай мовах, якія б былі цалкам прысвечаны дадзенай тэме. Адзіным грунтоўным выданнем з'яўляецца «Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч» Г.А. і А.Г. Каханоўскіх.

[1] Гл.: Городецкий М. Виленский музей древностей. По поводу тридцатилетия годовщины его создания // Исторический вестник. 1886. Т. 25. С. 601–620.
[2] Там жа. С. 606.
[3] Гл.: Пыпин А.Н. История русской этнографии. Белоруссия и Сибирь. СПб., 1892. Т. 4. С. 57–58.
[4] Гл.: Пыпин А.Н. Белорусская этнография // Журнал истории – политики – литературы. 1887. № 6. С. 120–127.
[5] Гл.: Tyszkiewicz // Encyklopedyja powszechna. Warszawa, 1867. T. 25. С. 860–864.
[6] Гл.: Archeologiczna komisya wilenska // Wielka encyklopedyja powszechna ilustrowana. Warszawa, 1890. T. 3. С. 633–638.
[7] Гл.: Tyszkiewicz J. Tyszkiewicziana: Milliteria, Bibliographia. Numizmatyka. Ryciny. Zbiory. Rezidencye etc. Poznan, 1903.
[8] Гл.: Карский Е.Ф. Белорусы. Вильно, 1904. Т. 1. С. 217.
[9] Гл.: Лагойскі раён Менскае акругі. Кароткае краязнаўчае апісанне. Менск, 1929.
[10] Гл.: Маркаў Л. Санаторна-курортнае лячэнне працоўных у Беларусі // Беларусь. 1945. № 11-12. С. 12–13.
[11] Гл.: Cehak-Holubowiczowa H. Muzeum starozitnosci wilenskiej komisji archeologicznej, a museum archeologiczne uniwersytetu Stefana Batoriego. Warszawa, 1938. С. 1–13.
[12] Гл.: Алексеев Л.В. Очерк истории белорусской дореволюционной археологии и исторического краеведения до 60-х годов XIX в. // Советская археология. 1967. № 4. С. 150–155.
[13] Там жа. С. 151.
[14] Там жа. С. 154.
[15] Гл.: Акуліч С. Музеі братоў Тышкевічаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. 1971. № 2. С. 49–51.
[16] Гл.: Антипов В.Г. Парки Белоруссии. Мн., 1975.
[17] Гл.: Акуліч С., Сасноўскі Б. Лагойск: Гісторыка-эканамічны нарыс. Мн., 1979.
[18] Гл.: Улащик Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. М., 1973.
[19] Гл.: Поболь Л.Д. Древности Белоруссии в музеях Польши. Мн., 1979. С. 156–189.
[20] Гл.: Каханоўскі Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI–XIX ст. Мн., 1984.
[21] Гл.: Каханоўскі Г.А. Адзін з ранніх даследчыкаў беларуска-літоўскага пагранічча // Быт і культура беларусаў. Мн., 1984. С. 100–101.
[22] Гл.: Каханоўскі Г.А. Адчыніся, таямніца часу: Гісторыка-літаратурны нарыс. Мн., 1984.

23 Гл.: Каханоўскі Г.А. Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму. Мн.,1989.
24 Гл.: Каханоўскі Г.А. Прадвесне навукі. Мн., 1990.
25 Гл.: Каханоўскі Г.А., Каханоўскі А.Г. Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч. Мн., 1992.
26 Гл.: Віж М. Чары даўніны. Мн., 1989. С. 39–61.
27 Гл.: Кудаба Ч. Па Віліі / Пер. з літ. Г. Войцік. Мн., 1992.
28 Гл.: Марціновіч А. Ля агню даўніны // Беларуская мінуўшчына. 1996. № 6. С. 36–39.
29 Гл.: Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Барысава і Барысаўскага раёна. Мн.,1997. С. 90–95.
30 Гл.: Гулак Н. Тышкевіцкі музей старажытнасцей: малюнкі спусташэння // Спадчына. 1995. № 2. С. 137–144.
31 Гл.: Яніцкая М. Скутак мары Тышкевічаў // Мастацтва. 1996. № 5. С. 32–33.
32 Гл.: Спірыдонаў М.Ф. Першая ардынацыя ў Беларусі // Гісторыка-археалагічны зборнік. Мн., 1996. № 8. С. 198–218.
33 Гл.: Яцкевіч З. Радавод Яўстафія Тышкевіча // Архівы і справаводства. 1999. № 2. С. 61–68.
34 Там жа. С. 61.
35 Гл.: Там жа.
36 Гл.: Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Лагойскага раёна: У 2 кн. Мн., 2003. Кн. 1. С. 22–161.
37 Гл.: Гужалоўскі А.А. Нараджэнне беларускага музея. Мн., 2002.
38 Гл.: Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Вілейскага раёна. Мн., 2003. С. 130–133.
39 Гл.: Балябін А. 1812 год у вядомай працы Я. Тышкевіча // Гоман Барысаўшчыны. 2005. № 12. С. 10.
40 Гл.: Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / Уклад., сістэматызацыя тэкстаў і камент. Т.В. Скідана. Мн., 2005. С. 23.
41 Гл.: Капцюг А. Граф Канстанцін Тышкевіч // Рэгіянальная газета. 2006. № 7. С. 18.
42 Гл.: Грынь С. У памяці лагайчан – назаўжды // Краязнаўчая газета. 2006. № 9. С. 3.
43 Гл.: Занкавіч А. Годны прадстаўнік – Канстанцін Тышкевіч // Шлях перамогі. 2006. № 51. С. 4.
44 Гл.: Мальдис А. Музей древностей // Советская Беларусь. 2007. № 155. С. 8.
45 Гл.: Жыгунова С. Постаць К.П. Тышкевіча і яго роля ў фальклорна-этнаграфічным даследаванні Лагойшчыны (матэрыялы для правядзення экскурсіі) // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: Зб. арт. / Пад навук. рэд. Р.М. Кавалёвай. Мн., 2008. Вып. 5. С. 43–48.
46 Гл.: Грыцкевіч А.П., Кулагін А.М. Лагойск // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Мн., 1987. С. 240–242.
47 Гл.: Каханоўскі Г.А. Тышкевіч Яўстафій Піевіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1985. Т. 5. С. 302.
48 Гл.: Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. Мн., 1989. С. 111–112.
49 Гл.: Атлас гісторыі Беларусі ад старажытнасці да нашых дзён: Дадат. да 6-томнай «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі». Мн., 2004.
50 Гл.: Пазнякоў В. «Ляліва» // Вялікае Княства Літоўскае: Энцыкл. Мн., 2006. Т. 2. С. 236.

Паступіў у рэдакцыю 07.05.10.

***Ганна Аляксандраўна Карпечанка*** – лабарант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў.